шляхта падтрымлівала ідэі, накіраваныя на дасягненне незалежнасці Рэчы Паспалітай пры дапамозе ўзброенага паўстання, да якога рыхтаваліся тайныя арганізацыі ў Каралеўстве Польскім.

1 Аскеназі Ш. Царство Польское. 1815— 1830 гг. М., 1915. С. 73.
2 Гл.: Воронков И. А. // Исторические записки. 1957. Т. 60. С. 295.
3 Гл.: Mochnacki M. Powstanie narodu polskiego w r. 1830 i 1831. Parys. 1834. S. 371.
4 Гл.: Ольшанский П. // Декабристы и польское национально-освободительное движение. М., 1959.
5 РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 100, арк. 87 (арк.).
6 Гл.: Шолкович С. // Заря. 1871. № 5. С. 121.
7 Там жа. С. 122.
8 РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 96, арк. 364—387.
9 Там жа. Спр. 100, арк. 85.
10 Там жа. Арк. 33(адв.).
11 РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 96, арк. 369.
12 Там жа. Спр. 100, арк. 85.
13 Там жа. Арк. 89(адв.), 90.
14 РДВГА. Ф. 156, воп. 1, спр. 138.
15 Там жа. Арк. 8(адв.), 15.
16 Там жа. Арк. 15(адв.), 16.
17 Там жа Арк. 3.
18 Там жа. Ф. 35, воп. 9, спр. 121.
19 Там жа. Спр. 121, арк. 1, 1(адв.).

І. Ф. РАМАНОЎСКІ, М. Г. ЖАРКОЎ

## БАРАЦЬБА НАРОДНЫХ МАС БЕЛАРУСІ СУПРАЦЬ САМАДЗЯРЖАЎЯ Ў РЭВАЛЮЦЫІ 1905—1907 гг.

Першая буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Расіі наспявала на працягу многіх гадоў. На рубяжы вякоў краіна з'яўлялася імперыялістычнай дзяржавай, але імперыялізм тут быў аплецены густой сеткай рэшткаў феадальна-прыгонніцкіх адносін. Неабмежаваная самадзяржаўная ўлада перашкаджала любым дэмакратычным пераўтварэнням, буйное памешчыцкае землеўладанне працягвала трымаць у сваёй залежнасці шмат фармальна свабодных сялян. Рабочы клас таксама падвяргаўся самай жорсткай эксплуатацыі з боку нованароджанай айчыннай і замежнай буржуазіі.

Усе гэтыя адмоўныя рысы эканамічнага і палітычнага жыцця краіны былі яшчэ ў большай ступені ўласцівыя Беларусі. З-за адсутнасці ў беларускіх нетрах жалезнай руды, нафты, каменнага вугалю і іншых карысных выкапняў тут развіваліся галоўным чынам прадпрыемствы лёгкай, апрацоўчай прамысловасці, заснаваныя на мясцовай сыравіне. Такая структура прамысловасці была адной з прычын перавагі на Беларусі невялікіх і дробных фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў. На іх працавалі беларусы (75 %), рускія, украінцы, яўрэі, палякі, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Рабочы дзень нават на буйных прадпрыемствах працягваўся 12—13 гадзін. Заработная плата не забяспечвала самы сціплы пражытачны мінімум рабочай сям'і. Не менш, калі не больш гаротным было становішча асноўнай масы сельскага насельніцтва нашага краю. Памешчыкам, казне і царкве належыла 57,3 % ворнай зямлі. Асобным магнатам (граф Патоцкі, Сапегі, Радзівілы і інш.) належыла па некалькі соцен тысяч дзесяцін. Малазямелле, нізкая ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур асуджалі масы сялянства на галечу і хранічны голад.

Велізарная краіна нястрымна ішла да сваёй першай рэвалюцыі. За 1901—1904 гг. толькі ў Беларусі адбылося 58 стачак і 25 дэманстрацый, 143 сялянскіх выступленні. Надыход рэвалюцыі значна паскорыла руска-японская вайна (студзень 1904 — жнівень 1905 г.). Паражэнні царскіх войскаў, асабліва пад Мукдэнам, падзенне Порт-Артура наглядна паказалі разлажэнне і гніласць царызму.

Рабочыя і сялянскія масы ўзняліся на барацьбу супраць царскага самадзяржаўя, за знішчэнне ўсіх перажыткаў прыгонніцтва, асабліва памешчыцкага землеўладання. Чашу народнага цярпення перапоўніла

«крывавая нядзеля» — 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу. У гэты дзень была расстраляна мірная 140-тысячная маніфестацыя рабочых. Забастоўкамі і дэманстрацыямі адказалі на крывавае злачынства царызму рабочыя імперыі. Іх падтрымалі 34 тысячы пралетарыяў Беларусі. Ужо ў студзені тут адбыліся палітычныя выступленні больш як у 20 гарадах і мястэчках. У час сямідзённай забастоўкі ў Гомелі да рабочых фабрык і майстэрань далучыліся і служачыя кантор, банкаў, аптэк. Адбыліся ўзброеныя сутычкі з паліцыяй, былі забітыя і параненыя. У Магілёве прайшлі дэманстрацыі рабочых і навучэнцаў гімназіі пад лозунгамі «Далоў царскае самадзяржаўе!».

Рэвалюцыйнымі выступленнямі ў шэрагу паветаў і мястэчак Беларусі да сярэдзіны лютага 1905 г. завяршылася першая фаза руху салідарнасці народных мас. Але ў лютым — сакавіку, калі нарадзілася новая рэвалюцыйная хваля, палітычныя стачкі змяніліся прафесійнымі забастоўкамі. Адбылося 26 дэманстрацый, 95 масовак; забастоўкі прайшлі ў Віцебску, Мінску, Барысаве, Пінску, Гродне — усяго ў 32 населеных пунктах[1]. Найбольш актыўным атрадам бастуючых сталі рабочыя пінскіх і мінскіх майстэрань Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыгунак.

У пачатку рэвалюцыі павышаную актыўнасць праявілі палітычныя партыі, якія імкнуліся ўзначаліць рэвалюцыйны рух на тэрыторыі Беларусі, дасягнуць узаемнай згоды для ўзмацнення барацьбы з царызмам, каардынаваць праграмныя ўстаноўкі і тактычныя дзеянні. Агульнымі праграмнымі патрабаваннямі дэмакратычнага лагера (РСДРП, Бунда, эсэраў, Беларускай Сацыялістычнай Грамады і іншых сацыял-дэмакратычных і леванародніцкіх партый і арганізацый) з'яўлялася знішчэнне самадзяржаўя, устанаўленне дэмакратычнай рэспублікі шляхам склікання Устаноўчага сходу, ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, прызнанне права нацый на самавызначэнне. І хоць яны мелі розныя погляды на сацыялізм і шляхі яго дасягнення, разыходзіліся па пытаннях вядучай сілы вызваленчага руху, стратэгіі і тактыкі барацьбы, бліжэйшыя мэты ў іх практычна супадалі. Для барацьбы з царызмам на прынцыпах тактыкі «левага блоку» («разам біць — розна ісці») у першым месяцы 1905 г. у Беластоку, Мінску, Вільні былі створаны кааліцыйныя камітэты, камісіі, бюро, саветы, якія аб'ядноўвалі прадстаўнікоў бундаўскіх, эсэраўскіх, сацыял-дэмакратычных арганізацый. Партыі левага блоку прымянялі розную тактыку: выпускалі пракламацыі, лістоўкі, супрацоўнічалі ў масавых аб'яднаннях, удзельнічалі ў арганізацыі забастовак, дэманстрацый, стварэнні сумесных баявых дружын. Кааліцыйныя камітэты выпрацоўвалі планы правядзення сходаў членаў арганізацый і актыву рабочых, фарміравалі групы агітатараў для абходу прадпрыемстваў, прызначалі сваіх прадстаўнікоў на фабрыкі і заводы. Першамайскія забастоўкі і маніфестацыі адбыліся ў 35 гарадах і мястэчках Беларусі. Рабочыя явачным парадкам ажыццяўлялі дэмакратычныя свабоды, самастойна выдавалі газеты, скарачалі час работы на прадпрыемствах да 9—10 гадзін, дамагаліся значнага павышэння заработнай платы, паляпшэння медыцынскага абслугоўвання і г. д.

Пад уздзеяннем рабочага руху ва антыўрадавыя акцыі ўключаліся сяляне. Значны ўплыў на ўзмацненне рэвалюцыйнага руху сялянства аказалі мясцовыя арганізацыі РСДРП, ПСР, БСГ, якія заклікалі не падпарадкоўвацца мясцовым уладам, паліцыі, захопліваць і заворваць памешчыцкія землі, адмаўляцца ад выплаты падаткаў. Усеагульная нянавісць да грабежніцкага памешчыцкага землеўладання падбівала сялян на стыхійныя масавыя патравы памешчыцкіх угоддзяў і парубкі лесу.

Як паведамляў магілёўскі губернатар, «сяляне з'яўляліся ў памешчыцкія лясы гуртам, сяклі і вывозілі дрэвы на вачах памешчыкаў і кіраўнікоў маёнткаў, а на ўгаворванне адказвалі заявай аб сваіх правах на памешчыцкі лес... часам аказвалі адкрытае супраціўленне лясной варце і чынам паліцыі»[2]. Восемдзесят сялян з вёсак Вішнёва і Лёсіна Полацкага павета высеклі многа лесу памешчыцы Лісоўскай. Паліцэйскія і ляснікі, якія прыбылі на месца парубкі, былі сустрэты ружэйным агнём[3]. У пачатку сакавіка 1905 г. у вёску Пухавічы Ігуменскага павета

Мінскай губерні для супакойвання сялян былі накіраваны паўэскадрона драгун і рота салдат. Сутычкі насельніцтва з паліцыяй і войскамі з гэтай нагоды адбыліся таксама ў Лепельскім, Дрысенскім і іншых паветах.

Летам 1905 г. за самавольную пасьбу жывёлы на памешчыцкім лугу былі пакараны жыхары вёскі Кішчыцы Чавускага павета . 17 чэрвеня сяляне на чале са старастам В. Канстанцінавым уступілі ў рукапашную схватку з выкліканымі для іх утаймавання салдатамі. Тады ротны камандзір аддаў загад страляць. Было забіта 8 чалавек і 15 паранена, 15 сялян аддадзена пад суд[4]. Часам сяляне не абмяжоўваліся захопам памешчыцкай зямлі, а ўрываліся на панскія двары, забіралі хлеб, жывёлу і птушку, спальвалі канторскія кнігі з запісамі аб сваіх даўгах і павіннасцях, грамілі маёнткі. За час рэвалюцыі на Беларусі сяляне спалілі 45 памешчыцкіх маёнткаў і 30 млыноў.

Вострай формай класавай барацьбы супраць памешчыкаў былі масавыя забастоўкі сялян-падзёншчыкаў і батракоў. Спыняліся не толькі работы па найму, але не выконваліся адработкі, памешчыцкія лугі і палі стаялі няўбранымі. Усеагульнай сялянскай забастоўкай у канцы чэрвеня 1905 г. былі ахоплены Гродзенскі, Ваўкавыскі, Мазырскі, Слуцкі паветы і інш.

Восенню 1905 г. характар рэвалюцыйных выступленняў у многім вызначаўся Кастрычніцкай усерасійскай палітычнай стачкай. На Беларусі вядучую ролю ў арганізацыі стачкі адыгралі, як і ў Расіі, чыгуначнікі. Забаставалі рабочыя і служачыя Гомеля, Мінска, Оршы. У Гомелі да чыгуначнікаў далучыліся студэнты, супрацоўнікі многіх устаноў. Арганізаваная 14 кастрычніка дэманстрацыя закончылася сутыкненнем з войскамі. У сувязі з аб'явай царскага маніфеста 17 кастрычніка перад гарадской управай сабралася каля 30 тыс. чалавек. Рабочыя чыгуначных майстэрань арганізавалі баявую дружыну і патрулíравалі вуліцу. У Мінску аб царскім маніфесце даведаліся на наступны дзень. 18 кастрычніка ля вакзала Лібава-Роменскай чыгункі пачаўся мітынг, на якім прысутнічала да 20 тыс. чалавек[5]. Па патрабаванню ўдзельнікаў мітынгу былі вызвалены палітычныя зняволеныя, але губернатар П. Р. Курлоў загадаў расстраляць бяззбройных рабочых. Было забіта 80 і 300 чалавек паранена. У адозве да грамадзян Мінская група РСДРП патрабавала аддаць пад суд Курлова і іншых віноўнікаў масавага расстрэлу, забяспечыць дэмакратычныя свабоды, заклікала гараджан брацца за зброю. На палітычныя дэманстрацыі і мітынгі ўрад адказаў чарнасоценнымі пагромамі, забойствамі рабочых, актыўных інтэлігентаў. Сутыкненні з паліцыяй у гэтыя дні адбыліся ў Смаргоні, Полацку, яўрэйскія пагромы — у Рэчыцы, Оршы, Гомелі.

Задачы рэвалюцыі патрабавалі арганізацыі баявых атрадаў для абароны ад пагромных акцый царызму. З мэтай забеспячэння грамадскага парадку ў кастрычніцкія дні ў гарадах, на чыгуначных вузлах Беларусі рабочыя стваралі такія атрады, а ў Віцебску і Полацку — народную міліцыю. Нярэдка ўзброеныя дружыны выкарыстоўваліся для аховы мітынгаў і дэманстрацый ад чарнасоценцаў.

Кастрычніцкія падзеі садзейнічалі ўзмацненню інтэграцыйных працэсаў у рэвалюцыйным асяроддзі. Для каардынацыі дзеянняў у гарадах і мястэчках Беларусі на аснове пагадненняў паміж рэвалюцыйнымі арганізацыямі былі створаны кааліцыйныя саветы, камісіі, камітэты. Яны аб'ядноўвалі галоўным чынам прадстаўнікоў партый эсэраў, Бунда, сацыял-дэмакратаў і чыгуначнага саюза. У некаторыя камітэты ўваходзілі прадстаўнікі Беларускай сацыялістычнай грамады. Яны супрацоўнічалі перш за ўсё з тымі рэвалюцыйнымі арганізацыямі, якія праводзілі работу ў вёсцы. Пры іх дапамозе распаўсюджваліся новыя для сялян формы руху — палітычныя сходы, мітынгі, забастоўкі.

У ходзе Кастрычніцкай стачкі ўзніклі Саветы рабочых дэпутатаў. Гэта былі сапраўды новыя органы новай улады, якія ішлі на змену традыцыйным інстытутам царскай адміністрацыі. На Беларусі функцыі органаў рэвалюцыйнай улады выконвалі кааліцыйны Савет у Мінску, забастовачныя камітэты ў Баранавічах, Мазыры, Гомелі, Пінску,

Ваўкавыску, Лунінцы, кааліцыйная камісія ў Віцебску. Яны абвясцілі 8-гадзінны рабочы дзень, свабоду друку, змагаліся са спекуляцыяй, стваралі народныя рэвалюцыйныя суды, баявыя дружыны, дабіваліся палітычнага і грамадзянскага раўнапраўя. У Мінскі кааліцыйны Савет, створаны пасля курлоўскага расстрэлу, уваходзілі прадстаўнікі ад мясцовых камітэтаў эсэраў, Бунда, мінскай групы РСДРП і Лібава-Роменскага камітэта ўсерасійскага чыгуначнага саюза. Савет стварыў камісію ўзаемадапамогі, суд гонару, некалькі дзён трымаў пад сваім кантролем чыгуначны вузел.

У ходзе рэвалюцыі 1905—1907 гг. многія партыі пашыралі ўплыў на прафсаюзныя, студэнцкія, ваенна-рэвалюцыйныя арганізацыі. Пад уздзеяннем партыйнай прапаганды адбыліся салдацкія выступленні ў Гродне, Віцебску, Брэсце, Магілёве, Баранавічах, Бабруйску. У ліпені 1905 г. членам ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі станцыі Мінск удалося ўзбунтаваць салдат чыгуначнага батальёна, які ехаў на Далёкі Усход. Салдаты заявілі, што «спачувальна адносяцца да «Пацёмкіна», варожа — да вайны, на якую іх вязуць, і асабліва да ўрада». У снежні мінскі губернатар паведамляў камандуючаму войскамі Віленскай ваеннай акругі, што большасць ніжэйшых чыноў Баранавіцкай чыгуначнай брыгады пераканана ў неабходнасці звяржэння дзяржаўнага ладу ўсімі магчымымі сродкамі, нават з прымяненнем зброі[6].

Суровы службовы рэжым у Бабруйскім дысцыплінарным батальёне выклікаў абурэнне прыпісаных да яго 900 салдат і 300 матросаў Балтыйскага флоту. У знак пратэсту супраць здзеклівых умоў службы тры роты адмовіліся ісці на страявыя заняткі і ўльтыматыўна патрабавалі ад начальніка крэпасці адмяніць цялесныя пакаранні. Паўстанцы не выканалі загад здаць зброю, разагналі афіцэраў, спрабавалі прарвацца ў горад. Палкі Бабруйскага гарнізона адмовіліся выканаць загад аб падаўленні паўстання. Тады ў горад прыбыла карная экспедыцыя на чале з генералам Арловым. Карнікі акружылі бунтарскія казармы і пад пагрозай артылерыйскага абстрэлу прымусілі паўстанцаў здацца. Розным мерам судовага пакарання было падвергнута 100 паўстанцаў, 12 найбольш актыўных суд прыгаварыў да расстрэлу, 15 — да катаргі[7].

9 снежня пачалося ўзброенае паўстанне ў Маскве. Рабочыя гераічна змагаліся супраць рэгулярных войскаў і паліцыі. Узброеныя паўстанні, што адбыліся ў Растове-на-Доне, Краснаярску, Ніжнім Ноўгарадзе і іншых буйных прамысловых цэнтрах імперыі, хутка былі жорстка задушаны. Самадзяржаўе перайшло ў рашучае наступленне на рэвалюцыю. Але зламаць супраціўленне народа ўдалося не адразу, барацьба працягвалася.

На Беларусі снежаньскія палітычныя забастоўкі ахапілі 17 гарадоў і мястэчак. У іх удзельнічалі каля 44 тыс. рабочых. У некаторых гарадах (Гомель, Баранавічы) напружанасць барацьбы была блізкай да ўзброенага паўстання. Але мясцовыя рэвалюцыйныя арганізацыі праявілі нерашучасць, чакаючы, магчыма, вынікаў барацьбы ў цэнтры імперыі.

У 1906 г. 46,9 % рабочых пяці паўночна-заходніх губерняў яшчэ ўдзельнічалі ў стачках. Каб падтрымаць снежаньскае ўзброенае паўстанне масквічоў, забаставалі беларускія чыгуначнікі. Рабочыя Гомеля вырашылі не прапускаць на Маскву карных вайсковых эшалонаў. Уся ўлада на Гомельскім чыгуначным вузле знаходзілася ў руках рабочых. Яны імкнуліся забяспечыць недатыкальнасць асобы, свабоду слова, друку, саюзаў і сходаў, адмяніць смяротную кару, вызваліць палітычных зняволеных. У данясенні ў дэпартамент паліцыі ад 19 снежня паведамлялася, што Пінск у руках узброеных рэвалюцыянераў. Забастоўкі суправаджаліся дэманстрацыямі, сходамі, мітынгамі. Рабочыя набывалі зброю, стваралі баявыя дружыны, выводзілі са строю паравозы, разбуралі тэлеграфныя лініі, каб іх не змаглі выкарыстаць царскія ўлады супраць рэвалюцыі. Масавымі, актыўнымі дзеяннямі адзначалі працоўныя Беларусі гадавіну расстрэлу рабочых у Пецярбургу, а таксама пралетарскае свята — 1 Мая, калі ў 40 гарадах і мястэчках адбыліся стачкі і іншыя

антыўрадавыя акцыі. У другой палове 1906 г. колькасць палітычных выступленняў рабочых рэзка ўпала, таму што ўрад перайшоў да адкрытага ваеннага тэрору. Прыкладна ў два разы ў параўнанні з 1905 г. знізілася і колькасць удзельнікаў эканамічных стачак на Беларусі. Але сялянскі рух летам 1906 г. сваім размахам набліжаўся да асенняга ўздыму 1905 г. Толькі ў чэрвені—ліпені ў беларускіх губернях адбылося больш за 200 выступленняў. «Рэвалюцыйны рух са стыхійнай хуткасцю і сілай ахоплівае сялянскія масы... Патрэбна прыняць надзвычайныя меры і прыслаць конныя войскі»[8], — тэлеграфаваў Клімавіцкі прадвадзіцель дваранства міністру ўнутраных спраў. Масавы характар набылі захопы памешчыцкіх зямель, сельскагаспадарчыя забастоўкі. Вялікае выступленне адбылося ў маёнтку Даманаўшчына Гродзенскага павета. У адказ на спробу сялян вёскі Яскевічы захапіць зямлю графіні Красінскай выкліканая паліцыя арыштавала шэсць галоўных «падбухторшчыкаў», што абурыла ўсю вёску: у паліцэйскіх паляцелі палкі і камяні. Праз некалькі дзён сяляне зноў выйшлі ў поле, каб не даць батракам заараць панскую зямлю. Калі натоўп сялян ізноў сустрэў паліцэйскіх каменнем, тыя адкрылі агонь і два чалавекі былі цяжка паранены[9]. У вёсках Кунзевічы, Мінюцычы, Ганцавічы, Любонічы і Таршычы Навагрудскага павета жыхары не дазвалялі davераным памешчыка наймаць нетутэйшых людзей на работу. Мясцовая паліцыя не змагла справіцца з хваляваннем сялян. На дапамогу ёй губернатар спешна накіраваў у павет паўсотні казакоў Таманскага палка[10].

Увосень 1906 г. з-за нізкай аплаты працы пачаліся забастоўкі батракоў і падзёншчыкаў. Найбольш актыўна яны праходзілі ў Віленскім і Ашмянскім паветах Віленскай губерні, Слуцкім, Ігуменскім Мінскай губерні і ў Пружанскім павеце Гродзенскай губерні. Забастоўшчыкі патрабавалі павялічыць падзённую плату і не дапускалі да работы сялян, нанятых у іншых паветах.

У сакавіку—маі 1907 г. сялянскія выступленні адбываліся толькі ў асобных вёсках, а з ліпеня спыніліся канчаткова.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг., нягледзячы на паражэнне, абудзіла палітычную свядомасць народа і аказала вялікі ўплыў на асаблівасці далейшага развіцця палітычнага руху ў краіне.

1 Гл.: История рабочего класса Белорусской ССР. Мн., 1984. Т. 1. С. 217.
2 Ш а б у н я К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962. С. 188.
3 Гл.: Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1953. Т. 3. С. 498.
4 Гл.: М а й з е л ь Л. Н. 1905—1907 гг. на Беларусі. Мн., 1934. С. 94.
5 История Беларуси. Вопросы и ответы. Мн., 1993. С. 59.
6 Гл.: Беларуская савецкая энцыклапедыя. Мн., 1970. Т. 2. С. 135.
7 Гл.: Л и п и н с к и й Л., Л у к ь я н о в Е. Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900—1907 гг.). Мн., 1968. С. 140, 141.
8 Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Мн., 1955. С. 488.
9 Документы и материалы по истории Белоруссии... Т. 3. С. 568.
10 Гл.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. С. 576.

А. М. ВАСІЛЬЕВА

## ДА ПЫТАННЯ АБ УЗНІКНЕННІ БЕЛАРУСКАГА КАТАЛІЦКАГА РУХУ

Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, адна з найбольш уплывовых каталіцкіх палітычных сіл, дзейнічала пераважна на тэрыторыі Заходняй Беларусі з 1917 па 1939 г. Вядома, што большасць беларускага насельніцтва, у тым ліку і Заходняй Беларусі, складалі праваслаўныя. Таму ўзнікае пытанне: чаму менавіта каталіцкі рух аказаўся найбольш жыццяздольным і, нягледзячы на моцны ўціск і прамыя рэпрэсіі польскіх уладаў, пратрываў да 1939 г.?